# СТАНАЎЛЕННЕ БЕЛДЗЯРЖМУЗЕЯ ГІСТОРЫІ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ

**А. А. Гужалоўскі**

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, пр. Незалежнасці, 4, 220030, г. Мінск, Рэспубліка Беларусь, huzhalouski@bsu.by*

Артыкул прысвечаны аналізу ўзнікнення і першых гадоў дзейнасці Белдзяржмузея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, характарызуюцца асноўныя напрамкі яго работы: камплектаванне фондавага збору, праектаванне стацыянарнай экспазіцыі і выставак, арганізацыя культурна-адукацыйнай дзейнасці. Паказана вядучая роля партыйнага кіраўніцтва рэспублікі ў арганізацыю музея, а таксама ўклад яго першых супрацоўнікаў у стварэнне першай ў СССР музейнай установы, цалкам прысвечанай мемарыялізацыі падзей Вялікай Айчыннай вайны.

***Ключавыя словы:*** Вялікая Айчынная вайна; камісія; музей; экспазіцыя; экспанат.

# СТАНОВЛЕНИЕ БЕЛГОСМУЗЕЯ ИСТОРИИ ВЕЛИКОЙ ОТЕЧЕСТВЕННОЙ ВОЙНЫ

**А. А. Гужаловский**

*Белорусский государственный университет, пр. Независимости, 4, 220030, г. Минск, Республика Беларусь, huzhalouski@bsu.by*

Статья посвящена анализу возникновения и первых лет деятельности Белгосмузея истории Великой Отечественной войны, характеризуются основные направления его работы: комплектование фондового собрания, создание стационарной экспозиции и выставок, организация культурно-просветительской деятельности. Показана ведущая роль партийного руководства республики в организации музея, а также вклад его первых сотрудников в создание первого в СССР музейного учреждения, целиком посвященного мемориализации событий Великой Отечественной войны.

***Ключевые слова:*** Великая Отечественная война; комиссия; музей; экспозиция; экспонат.

# BEGINNING OF THE BELARUSIAN STATE MUSEUM OF GREAT PATRIOTIC WAR

**A. A. Huzhalouski**

*Belarusian State University, Niezaliežnasci Avenue, 4, 220030, Minsk, Republic of Belarus, huzhalouski@bsu.by*

The primary areas of the Belarusian State Museum of the Great Patriotic War's first years activities are described in this article, which focuses on the acquisition of the collections, the development of a stationary and temporary exhibitions, and the organization of cultural and educational events. It demonstrates the Communist Party of Belarus leadership's major

involvement in the museum's organization and the early staff members' contributions to the establishment of the first museum in the Soviet Union solely devoted to commemorating the Great Patriotic War.

***Keywords:*** Great Patriotic War; Committee; museum; exhibition; exhibit.

15 ліпеня 1941 г. выйшаў адрасаваны музейным супрацоўнікам дырэктыўны ліст Народнага камісарыята асветы РСФСР. Ён, у прыватнасці, паведамляў: «Наш народ уступіў у Вялікую Айчынную вайну, і ў гэтай вайне фашысцкая гадзіна будзе знішчана… Работа музеяў павінна спрыяць выхаванню людзей, бязмежна адданых радзіме, гатовых у любую хвіліну, па закліку партыі і ўрада стаць за справу Леніна — Сталіна, здзяйсняць подзвігі нечуванай мужнасці і гераізму ў барацьбе з фашысцкімі цемрашаламі, а калі трэба, то і аддаць за радзіму сваё жыццё» [1, с. 3]. Гэты першы з пачатку вайны «праграмны» ведамасны дакумент быў прыняты ў развіццё указанняў ЦК ВКП(б) і савецкага ўраду аб перабудове ўсёй дзейнасці дзяржаўных устаноў і грамадскіх арганізацый на ваенны лад.

У лісце Наркамасветы была прадстаўлена разгорнутая праграма дзейнасці савецкіх музеяў у ваенных умовах, пазначаны яе формы, падкрэслівалася неабходнасць стварэння стацыянарных і перасоўных выставак аб вайне, гераічнай барацьбе савецкага народа на фронце і ў тыле, аб героях-земляках. Дакумент пакрокава тлумачыў, які павінен быць ідэалагічны змест музейных экспазіцый. Уся культурна-адукацыйная і навукова-даследчая работа музеяў павінна была быць падпарадкавана інтарэсам барацьбы з фашысцкімі захопнікамі, задачы разгрому ворага. Акцэнт у экскурсійнай працы трэба было рабіць на тэмах: «Фашызм — злейшы вораг чалавецтва», «Наша справа справядлівая, мы пераможам», «Расавая тэорыя фашызму» і інш. [1, с. 5].

Аднак на першым этапе Вялікай Айчыннай войн гэтую задачу музеям было вырашыць вельмі цяжка: экспанатаў, якія служылі б «доказнай базай» гэтых тэзісаў, як і брашур і навуковых артыкулаў, практычна не было. Таму першапачаткова героіка распачатай вайны раскрывалася з выкарыстаннем рэліквій мінулых перамог. Сведчаннем гэтаму з'яўлялася разгорнутая ў верасні 1941 г. у Дзяржаўным гістарычным музеі сумесная выстаўка маскоўскіх музеяў «Вялікая Айчынная вайна савецкага народа супраць германскага фашызму», дзе толькі 4 з 10 раздзелаў былі прысвечаны непасрэдна заяўленай тэме. Астатнія мелі «гістарычны» характар. Падобныя выстаўкі ў 1941 г. былі разгорнуты ў музеях Ленінграда і іншых савецкіх гарадоў [2, с. 13].

Новы штуршок музеефікацыі падзей Вялікай Айчыннай вайны дала выдадзеная 18 чэрвеня 1942 г. Наркаматам асветы РСФСР інструкцыя «Аб зборы рэчавых і дакументальных матэрыялаў Вялікай Айчыннай вайны»,

якая ў шэрагу шматлікіх іншых аб'ектаў прапаноўвала музейнікам збіраць улёткі, аб'явы, лісты, загады. Важным крокам навукова-практычнага асваення тэмы вайны стала «Кіраўніцтва да збірання матэрыялаў па гісторыі Вялікай Айчыннай вайны», распрацаванае па даручэнні Наркамата асветы прафесарам Навукова-даследчага інстытута краязнаўчай і музейнай работы М. М. Каробкавым і разасланае па музеях. У им была выкладзена праграма камплектавання матэрыялаў па сучаснасці, даваліся прафесійныя метадычныя рэкамендацыі па арганізацыі збіральніцкай работы, а таксама па пытаннях захоўвання і выкарыстання сабраных калекцый. Зыходзячы з асаблівасцей часу, М. М. Карабкоў у якасці асноўнай задачы бягучага камплектавання разглядаў фарміраванне крыніцавай базы для стварэння выставак і стацыянарных экспазіцый, прысвечаных вайне [3, с. 9–11].

Можна выказаць меркаванне, што згаданыя вышэй инструкцыі, навукова-метадычныя распрацоўкі, арганізаваныя ў музеях «ваенныя» выстаўкі абумовілі з’яўленне 2 чэрвеня 1942 г. пастановы ЦК КП(б) аб стварэнні ў Маскве рэспубліканскай Камісіі па збору дакументаў і матэрыялаў Айчыннай вайны. Старшынёй Камісіі быў прызначаны сакратар ЦК КП(б)Б па прапагандзе Ц. С. Гарбуноў, яе адказным сакратаром — журналіст В. Д. Стальноў. Галоўнымі крыніцамі паступленняў матэрыялаў у Камісію былі камандзіроўкі яе супрацоўнікаў у вайсковыя часткі, партызанскія фармаванні, на эвакуіраваныя беларускія прадпрыемствы. Яны прывозілі лісты з франтоў, інфармацыю аб баевых дзеяннях партызан, падпольныя газеты і часопісы, улёткі, фотаздымкі і інш. Вялікую ролю ва ўзбагачэнні калекцый адыграла так званая «Віцебская (Суражская) брама». Супрацоўнікі накіроўваліся праз іх у нямецкі тыл для збору матэрыялаў. Пасля ліквідацыі брамы, гэта работа праводзілася з дапамогаю ваенна-транспартнай авіяцыі. Паводле успамінаў удзельнікаў тых падзей, па вяртанні самалётаў з нямецкага тылу, на лётнае поле выходзілі супрацоўнікі камісіі, сценаграфісткі, каб не губляючы часу запісаць апавяды пілотаў і партызан [4, с. 5].

Вынікі першых шасці месяцаў дзейнасці Камісіі былі прадстаўлены на выстаўке «Беларусь жыве, Беларусь змагаецца, Беларусь была і будзе Савецкай», якая адкрылася ў пачатку лістапада 1942 г. у Дзяржаўным гістарычным музеі ў Маскве. Яе дырэктарам была прызначана былы супрацоўнік Дзяржаўнай мастацкай галерэі БССР А. В. Аладава. Выстаўка складалася з пяці раздзелаў, на ёй было прадстаўлена 313 экспанатаў, якія адлюстроўвалі як жыццё ў акупіраванай Беларусі, так і ўдзел беларусаў у баях на франтах, а таксама тылавой працы [5, с. 4].

Пасля вызвалення Беларусі летам 1944 г., Камісія была пераведзена ў Мінск, дзе работала да 1946 г. У верасні 1944 г. з Масквы ў Мінск перавезлі

таксама выстаўку «Беларусь жыве…», якая стала асновай першай экспазіцыі Белдзяржмузея Вялікай Айчыннай вайны. Падчас прыбыцця ў Мінск экспанатаў выстаўкі, ЦК КП(б)Б у верасні 1943 г. ужо было прынята рашэнне аб стварэнні ў сталіцы БССР «музея па гісторыі барацьбы беларускага народа з нямецка-фашысцкімі акупантамі ў Вялікую Айчынную вайну» [6, арк. 57]. Работы па падрыхтоўцы да адкрыцця музея курыраваў асабіста старшыня СНК БССР П. К. Панамарэнка. Музею перадалі адзіны з лепшых ацалеўшых у Мінску будынкаў — Дом прафсаюзаў на плошчы Свободы, надалі 1-ю катэгорыю, зацьвердзілі штатную структуру ў памеры 167 чалавек. У адміністрыцыйным і гаспадарчым адносінах ён падпарадкоўваўся Упраўленню па справах мастацтваў пры СНК БССР, у ідэалагічным — ЦК КП(б)Б.

Дырэктарам музея быў прызначаны В. Д. Стальноў (ужо ў 1946 г. яго змяніў былы дырэктар Музея рэвалюцыі БССР М. Я. Гракаў), яго намеснікам па навуковай рабоце — У. У. Саблін. У першы навукова-творчы калектыў уваходзілі навуковыя супрацоўнікі П. М. Ганчароў, М. С. Абрамаў, П. С. Лавецкі, В. С. Раманоўская, мастакі С. Г. Раманаў, А. С. Бархаткоў і Г. Ф. Бржазоўскі і інш. У гэты перыяд пэўны час у музеі працавалі будучыя вядомыя беларускія гісторыкі — члены-карэспандэнты АН БССР К. І. Шабуня і У. М. Сікорскі. Ніводны з іх не меў вопыта музейнай работы. Гэта былі пераважна настаўнікі, журналісты, мастакі, якія змагаліся на франтах альбо ўдзельнічалі ў партызанскім і антыфашысцкім руху. Але недахоп ведаў і вопыту на першых кроках кампенсаваўся энтузіязмам і падтрымкай з боку партыйнага і ваеннага кіраўніцтва.

Увосень 1944–увесну 1945 гг. было праведзена чатыры камандзіроўкі па збору экспанатаў на фронт, две у Польшчу, две у Берлін, якія далі тысячы каштоўных прадметаў. Адначасова актыўныя пошукі вяліся на тэрыторыі БССР. Атмасферу, якая панавала ў калектыве музея ў тыя дні перадаюць успаміны П. М. Ганчарова: «Дамовіліся на пачатак арганізаваць выстаўку „Узбраенне беларускіх партызан“. Але дзе ўзяць экспанаты? Партызанскія атрады раззброіліся пад Мінскам, у Лошыцы. Я, прызначаны начальнікам партызанскага аддзела музея, накіраваўся да прадстаўніка штаба партызанскага руху… Дазвол атрымаў. Але як даставіць усю гэтую зброю ў Мінск? Стаў шукаць ў горадзе грузавыя машыны. Каюсь: угаворваў вадзіцеля зрабіць незаконны рэйс. А што было рабіць? Разлічваўся са свайго рэчавага мяшка. Так, так! Перад тым як раз атрымаў заробак — амаль за палову сорак першага года, за сорак другі, сорак трэці і за поўгады сорак чацьвёртага. Амаль цэлы мяшок грошаў. Дык вось першыя буйныя сумы

выдаткаваў на аплату транспарта, які даставіў з Лошыцы ў музей вінтоўкі, кулямёты, самаробныя міны, гарматы, адрамантаваныя ў лясных майстэрнях, трафейныя аўтаматы…» [7, с. 8].

22 кастрычніка 1944 г. апоўдні адбылося ўрачыстае адкрыццё Белдзяржмузея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны. Экспазіцыя ў выглядзе двух выставак «Узбраенне беларускіх партызан» і «Бальшавіцкі друк Беларусі ў дні Вялікай Айчыннай вайны» была размешчана ў 15 адрамантаваных сіламі былых партызан залах. Адначасова з адкрыццём музея у раёне Дома Чырвонай Арміі была разгорнута Рэспубліканская выстаўка ўзораў трафейнага ўзбраення. Выстаўка складалася з чатырох раздзелаў: артылерыйскага, танкавага, авіяцыйнага і інжынернага. Большая частка ўзбраення, якое мела нямецкае, французскае, галандскае, бельгійскае, чэхаславацкае, югаслаўскае, польскае і нарвежскае паходжанне было дастаўлена з месцаў баёў у Мінскім і Бабруйскім «катлах». Экскурсіі па выстаўцы праводзілі афіцэры — удзельнікі аперыцыі «Баграціён». У 1948 г. выстаўка была дэманціравана [8, с. 4].

Пасля адкрыцця музея працягвалася інтэнсіўнае павелічэнне яго калекцый. Ішлі актыўныя паступленні ад Камісіі па збору дакументаў і матэрыялаў Айчыннай вайны, Беларускага штаба партызанскага руху, прыватных асоб, установ і арганізацый. На аснове гэтых паступленняў 1 мая 1947 г. была адкрыта першая стацыянарная экспазіцыя, якая складалася ўжо з шасці раздзелаў:

1) гістарычнае развіццё беларускага народа;

2–3) Вялікая Айчынная вайна Савецкага Саюза;

4) партызанскі рух у Беларусі;

5) вызваленне Савецкай Беларусі;

6) узнаўленне народнай гаспадаркі і культуры Савецкай Беларусі.

З гэтай структуры нецяжка заўважыць, што ў адсутнасці Беларускага дзяржаўнага музея, функцыі апошняга кіруючыя органы імкнуліся ўскласці на Белдзяржмузей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны. Аднак, улічваючы змест калекцый і тэрміны ў якія трэба было скончыць работы, спраектаваць экспазіцыю па «гістарычнаму развіццю беларускага народа» было немагчыма. Адразу ж пасля адкрыцця, новая экспазіцыя стала аб’ектам крытыкі Упраўлення агітацыі і прапаганды ЦК КП(б)Б. Ад кіраўніцтва музея патрабавалі зняць тэму «Другі фронт», скарацiць паказ матэрыялаў аб масавым знішчэнні яўрэяў у мінскім гета. Адначасова экспазіцыя крытыкавалася за схематычны паказ падзей на франтах вайны, даваеннай гісторыі Беларусі, а таксама першых пасляваенных гадоў [9, арк. 39].

У 1948–1949 гг. амаль ва ўсе залы Белдзяржмузея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны былі ўнесены змены. Найбольш сур’ёзнай метадычнай

перарацоўцы падлягалі цяжкія для музейнага адлюстравання тэмы: «Савецкая Армія — вызваляльніца народаў Еўропы ад гітлераўскага рабства», «Народная гаспадарка і культура Савецкай Беларусі напярэдадні Вялікай Айчыннай вайны» і г. д. Адначасова прыводзілася ў парадак фондавая «гаспадарка» музея — падчас адкрыцця першай стацыянарнай экспазіцыі палова прадметаў калекцый не была інвентарызавана, у тым ліку каля тысячы экспанатаў, якія знаходзіліся ў экспазіцыйных залах. Наладжваліся сувязі з прадпрыемствамі і вучэбнымі ўстановамі горада з мэтай арганізацыі наведвання музея на сталым грунце. Новы імпульс далейшаму развіццю музея павінен быў надаць Савет музея, куды ўвайшлі 26 прадстаўнікоў навуковых і грамадскіх устаноў, а таксама музеяў горада.

Такім чынам, першае пяцігоддзе работы Белдзяржмузея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны ўяўляе вялікую цікавасць для гістарыяграфіі гісторыі Беларусі перыяда вайны і беларускага музеязнаўства як перыяд выключна інтэнсіўнага збірання фондавых калекцый, творчых пошукаў у экспазіцыйнай рабоце, разнастайных, не заўсёда ўдалых, спроб зрабіць экспазіцыю найбольш зразумелай масаваму гледачу. За першыя пяць гадоў музей сабраў каштоўныя калекцыі, яго экспазіцыю аглядзела звыш 100 тыс. чалавек [10, арк. 93].

## Бібліяграфічныя спасылкі


1. Ко всем работникам музеев Наркомпроса РСФСР // Работа политико-просветительных учреждений в условиях военного времени: директивные и инструктивные материалы для музеев. Вып. 4. Москва: Гос. библиот.-библиограф. изд., 1943.
2. *Кантор Ю. З.* Невидимый фронт. Музеи Росии в 1941–1945 гг. Москва: Политическая энциклопедия, 2017.
3. *Коробков Н. М.* Руководство к собиранию материалов по истории Великой Отечественной войны (для музеев и краеведческих организаций). Москва: Нар. ком. прос. РСФСР, 1942.
4. *Воронкова И. Ю.* Создание и становление Белорусского государственного музея истории Великой Отечественной войны [очерк]. Минск: [Б. и.], 2001.
5. Беларусь жыве, Беларусь змагаецца. Выстаўка ў Дзяржаўным гістарычным музеі // Савецкая Беларусь. 1942. 28 кастр. № 94.
6. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). Ф. 4. Воп. 3. Спр. 1251.
7. *Щербаков А.* Обманчивая тишина музея // Огонёк. 1981. Май. № 20.
8. Беларускі дзяржаўны музей гісторыі айчыннай вайны // Звязда. 1944. 5 жніўня. № 48.
9. НАРБ. Ф. 790. Воп. 1. Спр. 154.
10. НАРБ. Ф. 974. Воп. 1. Спр. 45.